**УДК 39**

# “ЧОРТАВЫ” МЕСЦЫ Ў СТРУКТУРЫ КУЛЬТУРНАГА ЛАНДШАФТУ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ

***Д. В. ЖУКАЎ***
***(Прадстаўлен: д-р гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ)***

*Такі міфалагічны персанаж, як чорт, з’яўляецца найбольш вядомым і распаўсюджаным у народнай культуры ўсходніх славян, у тым ліку беларусаў. Аднак, дзе ён жыве ведаюць далёка не ўсі.*

***Ключавыя словы***: *чорт, чортава месца, чортава балота, чортаў камень, лазня, мост.*

Вобраз чорта з’яўляецца даволі частотным у народнай міфалогіі прасторы беларусаў, калі шэраг аб’ектаў культурнага ландшафту ў карціне свету вясковага насельніцтва трывала суадносіцца з нячыстай сілай. Так, вядомы даследчык традыцыйнай культуры Віцебшчыны М. Нікіфароўскі адзначаў: “*Улюбёнымі месцамі чортавых зборышчаў трэба лічыць пусткі, пакінутыя сялібы, старыя і напаўразбураныя пабудовы, млыны, пераважна ветраныя, месцы самазабойстваў, яры і наогул мясціны, куды рэдка ступае нага чалавека і куды даўно не заносіўся асвечаны прадмет”* [5, с. 25].

Шмат запісаў сведчаць аб тым, што чорт жыве побач с вадой, або ў самой вадзе. У працах П. Дземідовіча аб гэтым гаворыцца больш падрабязна: *“Не ўсе чэрці сядзяць у пекле: жаданне шкодзіць людзям цягне іх на паверхню зямлі. З гэтай мэтаю Чорт шукае сабе жытло бліжэй да чалавека і трымаецца ў тых месцах, дзе вельмі часта даводзіцца бываць чалавеку. Але як бы там ні было, Чорту найбольш даспадобы вада і балота; гэта – яго стыхія і паблізу іх ён стараецца выбраць галоўнае сваё жытло”* [3, с. 603].

У першую чаргу, размова ідзе пра балоты, само з’яўленне якіх звязана менавіта з чортам *“Міфалагічны генезіс балота як “чортавага стварэння” і яго геамарфалагічныя асаблівасці (сумесь вады і зямлі, пакрытая характэрнай расліннасцю) ляжаць у аснове трывалага суаднясення гэтага прыроднага локуса з ідэяй хаосу і нячыстай сілай”* [4, с. 158-159].

У сучасных уяўленняў беларусаў Падзвіння “Чортава балота” вызначаецца павышаным узроўнем небяспекі для чалавека *“Чортава балота ёсь. Прама па дарозе, там яно заросшая. […] Балота гібкая такоя, топкая, калі ўжо хто ў гэту трасіну ўлезіць, то ўжо ня вылезіць, вот яно і завецца Чортава. У балота ўцягаваіць чорт нейкі, туды і ўсё. Выйці чалавек ня можаць”* [6, с. 185].

Найбольш часта небяспека “чортава месца” выяўляецца ў тым, што чалавек, які туды трапляе, губляе арыентацыю ў прасторы *“У Чортавым балоце – там увесь час блудзілі. Я сама хадзіла. Бывала, хадзілі ў Заслонава. Рана ўставала, каб рана зайсці ў Заслонава. І там да самага віднага хадзілі і блудзілі. І мы самі хадзілі кругом, здаецца там лес, а там чорт знае што. Як развіднелася, дык тады ўбачылі і прыйшлі дамоў”* [6, с. 184]. Трэба адзначыць, што балотных урочышчаў з назвай “Чортава балота” і адпаведнымі фальклорнымі гісторыямі на Віцебшчыне даволі шмат. Толькі этнаграфічныя даследаванні Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта выявілі шэсць такіх аб’ектаў у Полацкім, Пастаўскім, Лепельскім і Сенненскім раёнах Віцебшчыны [6, с. 183 - 185].

Яшчэ адной катэгорыяй прыродных аб’ектаў, з якой вельмі часта суадносцца вобраз чорта, ёсць вялікія, прыкметныя валуны з паказальнымі назвамі “Чортаў камень”, “Чортава печ” *“Ёсць каля Лынтуп камень, які называюць “Чортаў”. Аднайчы, калі дадому вяртаўся адзін музыка, ён убачыў на камяні чарта, і чорт прымусіў, каб музыка іграў яму цэлую ноч. А калі настала раніца, чорт знік, а музыка без сіл пайшоў дахаты. З той пары і пачалі называць камень “Чортаў” [6, с. 240].*

Як і ў выпадку з “чортавымі балотамі”, валуны, суаднесеныя з нячыстай сілай, вядомыя мясцоваму насельніцтву тым, што ля іх чалавек губляецца ў прасторы і часе (распранаецца, кладзецца спаць, прыняўшчы за печ у хаце) *“Чэрці кладуць спаць на камяні Ай, гэта, мая дзетка, помню расказвалі. Вот адзін старык ішоў у горад, выпіўшы быў. Завялі яго чэрці на камень, раздзелі, разулі. Толькі ў адных падштаніках быў. Цёпла яму было, як на печы. Прасыпаецца, зуб на зуб не трапіць, – сядзіць на печы. І тое было, што разувалі. Завядуць, раздзенуць, пасодзюць. Ай-ай, таго чэрці ноч вадзілі, раздзелі, разулі. Чуць дамоў прышоў”* [6, с. 242].

У шэрагу выпадкаў вялікі валун выступае ў фальклорнай традыцыі як месца жыхарства чорта *“Здаравенны ляжаў камень. Было ў ім акно і жыў у ім чорт. У той дзярэўне Змяёўке жыла красівая дзевушка. І вот чорт украў дзевушку і перанёс у эты камень, і там аны жылі. Ну а бацькі ж іскалі. Хацелі адняць у чорта, усей акругай падняліся. Ён забраў яе і ўцякалі яны ў другоя места. Чэраз озера ляцелі і якраз граза была. Такоя прэданія было. Ударыла ў іх молнія і аны ўтанулі”* [6, с. 240].

Іншыя сюжэты сведчаць аб тым, што вялікія камяні могуць быць эпіцэнтрам актыўнасці нячыстай сілы ў начны час “*Каля камення ноччу збіраюцца чэрці, танчаць або гуляюць у карты*” [1, с. 556].

Паводле народных уяўленняў, чорт можа з'яўляцца чалавеку не толькі ў прыродных локусах, але і ў прасторы, засвоенай чалавекам, асабліва ў тых месцах (дарога, ростані, лазня), якія маюць выразную сімволіку "мяжы" паміж "сваім" і "чужым" светам. Невыпадкова, што вельмі часта ў аповядах пра нячыстую сілу фігуруе лазня, якая звычайна размешчана на мяжы сялібы *"Вот мы, маладзёж, падышлі раз паглядзець. Аж там (у бані) хахочуць, плёскаюць. Я адкрыла баню, аж там чэрці. І ў катле, і ў баку. Касматыя такія, валасы длінныя, ніжы жопы, чорныя, закапцелыя, ногі ў катлах ня відна. У меньшых рожкі меньшыя, у большых большыя. Яны на нас дажа і не глянулі. А назаўтра прышлі, аж вада ўся павыліта"* [6, с. 98].

Лазня можа з'ўляецца адным з месц жыхарства нячысціка, бо яна падобная да хаты, але ў ёй адсутнічае ненавістный яму абраз, які выконвае функцыю абярэга як ад чорта, так і ад яму падобных *"Ды я чарцей ўзапраўду бачыла. Я ж малая тады была. Гадоў можа дзесяць-адзінацаць. Жылі мы тады на хутары. Там, за мастом, па гэтым беразе. І вось зімой неяк мыліся ў бані. Памыліся. Пайшлі у хату. Холадна яшчэ так было. Маці мне кажа: "Збегай, паглядзі, нехта ў нашай бані парыцца". А там і ўпраўду дым з трубы ішоў, як нехта парыцца. І вось забяжала я ў прадбаньнік і дзьверы адкрыла. Ай! А там мужыкі голыя стаяць, хлешчуць, паруцца! А галовы чорныя, чорныя і хвасты. Хвасты – длінныя, а на канцы – мяцёлка такая. Самое цела бела, а вось галава чорная, чорная. Касматыя такія ў іх галовы. Во, як вас цяпер бачу, так і іх бачыла. Рагоў і капытоў не замеціла, гаварыць ня буду. Только галовы чорныя і хвасты. Ай, як пабегла я назад, прыбегла, сказала: "Якіейсці мужчыны мыюцца з хвастамі", а маці паслухала і туды ўжо не пашла. А я патом гэтай бані баялася і ў яе не хадзіла. У другую хадзіла. І чарцей больш не відзіла"* [6, с. 99].

Паводле некаторых сюжатаў становіцца зразумела, што каля лазні чалавек таксама мае магчымаць страціць арыентацыю ў прасторы. Вядома, гэтая асаблівасць з'явілася з-за таго, што лазня з'яшляецца інфернальным месцам *"Вот мой дзядуля казаў, што кажыць: "Я ні знаю, Бог ці ёсьць, а нячыстая сіла ёсьць". Вот выперліць яна там, так ён так мучыцца поўкіламетра… Хадзіў баню тапіць, ідзець адтуль, нібыта прыйдзіць да хаты, але ўсё роўна ні дайдзіць да хаты – узноў варочаецца. Нехта вадзіў і усё. Вось такое! Ну ён так, памоліцца Богу, папросіць Бога і кажыць: "Божанька, астаў мяне ужо на маім месці! Чаму мяне гэтак водзіць?" Ну і пройдзіць гэта усё. А болей такога нічога. Болей ж усё к Богу мы абрашчаліс. Мы ж толькі Бога верылі і ўсё, вот"* [6, с. 102].

Гэтаксама часта з вобразам чорта ў народных уяўленнях звязваецца і дарога *"У міфа-паэтычных і рэлігійных уяўленнях нашых продкаў дарога ўспрымалася як звязак паміж двумя пунктамі прасторы. І разам з тым гэтая геаграфічная адзінка – нічыйная зямля, поўная таямніц, небяспекі. Асабліва небяспечнымі лічыліся скрыжаванні і ростані. Там маглі збірацца нячысцікі і чарадзеі"* [2, с. 276]. Беларусы лічылі, што на дарозе таксама можна было сустрэцца з чортам, аб чым сведчыць наступная цытата: *"Ехаў нас адзін. А такая вечарынка была – Божа, Божа! – на дарозе. І яго завалалі. Кажуць: "Танцавай!" І ён танцаваў. Божа, Божа, яго і частавалі, і ён танцаваў. І за пазуху яму наклалі ў дарогу. Прыехаў дамоў, а там поўна конскага калу было"* [6, с. 99].

У міфалагічнай карціне свету беларусаў мост з'яўляецца сімвалам сувязі паміж "нашым" і "тым" светам. Менавіта таму на ім могуць збірацца нячысцікі *"Была цётка расказвала, што раз ішлі яны з вечарынкі, правадзілі ў Ноўкі сястру. А там стаялі чэрці на масту, у ладошкі хлопалі. Цётка гаворыць, што мы хахочым: "Не спужаешь!" А так, гаворыць, рагатые, бальшыя, чорныя чарты. Гаворыць, на масту. Як чалавек, як абязьяна – з хвастом, з рогамі бальшымі. Але не чапалі іх, не. Тады, як яны прайшлі, чарты і захлопалі у ладошкі"* [6, с. 104].

Мост таксама фігуруе ў сюжэтах, у якіх гаворка ідзе аб страце чалавекам арыентацыі ў прасторы "Ацец мой ілі дзед расказваў. Ішоў ён і нёс нам гасцінца за пазухай. А там – "Чортаў мост" – балоціна. Там кладачкі ляжалі і ўсегда мокра было. Дык ён толькі к утру дамоў прышоў. Прынес адну булачку, астальное чэрці расцягалі. А што там было не знаю. Калі заблудзіўся чалавек – точна чэрці вадзілі, ніяк не мог знайсці дарогу" [6, с. 244].

Ростані з'ўляюцца важнейшым элементам сувязі з інфернальным светам, менавіта таму *"на ростанях адбываецца сустрэча з чортам, а таксама заключэнне з ім пагадненняў т хаўрусаў"* [1, с. 432].

Такім чынам, зразумелым становіцца наступнае: беларусы лічылі "чортавымі" тыя месцы, якія былі "палохалымі" самі па сябе. Паводле сюжэтах нашых продкаў, нячыстая сіла ў такіх месцах выяўляецца, як правіла, у цёмны час сутак. Большасць гэтых локусаў аб'яднаная агульнай сімволікай "мяжы" паміж "сваім" і "чужым" светам. Ва ўсіх чортавых месцаў ёсць агульныя рысы, напрыклад, страта чалавекам арыентацыі ў прасторе. Гэта можна растлумачыць наступным чынам: так дарослыя пужалі маленькіх дзяцей, каб тыя не заблудзіліся, альбо не выходзілі з дому ноччу, ці познім вечарам.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік./ С. Санько, Т. Вадодзіна, У. Васілевіч [і інш.]; под ред. Людмілы Дучыц, Івана Крук, Уладзімера Лобача, Лiлii Салавей [і інш.] – Мінск: Беларусь, 2004. – 593 с.
2. Дучыц Л.,Клімковіч І. Сакральная геаграфія Беларусі—Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011, – 349 с.
3. Зямная дарога ў вырай: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. – Кн. 3 / Уклад., прадм., пер. і паказ. У. Васілевіча. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 654 с.
4. Лобач У.А. Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / Уладзімір Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 511 с.
5. Никифоровский Н.Я. Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. – Витебск: Паньков, 1995. – 85 с.
6. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – 292 с.